УДК 631.51 : 633.16

В. І. БАРТАШЭВІЧ, Л. Д. БАРТАШЭВІЧ

БЕЗАДВАЛЬНАЯ АПРАЦОЎКА ГЛЕБЫ ПАД ЯЧМЕНЬ

Са шматлікіх спосабаў мінімальнай апрацоўкі глебы, якія выкарыстоўваліся і прапаноўваліся за апошнія дваццаць гадоў, зараз найбольш шырока прымяняюць асенняе чызеляванне. Асенняе чызеляванне дазваляе дастаткова інтэнсіўна разрыхляць глебу, ствараць грубую паверхню і адначасова захоўваць на паверхні глебы вялікую колькасць пасляўборачных рэшткаў. Гэта мае першаступеннае значэнне пры правядзенні

асноўнай напаўпапарнай апрацоўкі цяжкасуглінкавай глебы. Першачарговую значнасць гэты спосаб апрацоўкі мае для схілавай глебы.

Вывучэнне чызелявання ў сістэме асноўнай апрацоўкі праводзілі ў калгасе імя Кірава Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў 1987—1989 гг. на дзярнова-падзолістай цяжкасуглінкавай глебе.

Мэтай доследа з'яўлялася вывучэнне эфектыўнасці чызелявання на розную глыбіню ў параўнанні з кантрольным варыянтам асноўнай апрацоўкі глебы — ворыва на глыбіню 20—22 см. Чызеляванне культыватарам чызельным КЧ-5,1 праводзілі ў два сляды з разрывам у часе (праз два-тры тыдні) па меры з'яўлення ўсходаў пустазелля. На ўсіх варыянтах асноўнай апрацоўкі глебы праводзілі папярэдняе лушчэнне БДТ пасля ўборкі папярэдніка — аўса.

Агульная плошча дзялянкі 100 м², уліковая 72 м², паўторнасць чатырохразовая.

Мінеральныя ўгнаенні ў дозе $N_{80}P_{80}K_{120}$ уносілі пад перадпасяўную культывацыю на 5—7 см з баранаваннем. Высявалі сорт ячменю Зазерскі 85 у норме 4,5 млн. усходжых зярнят на 1 га.

Для барацьбы з пустазеллем у фазе кушчэння ячменю ўносілі гербіцыд 2М-4ХП у дозе 2 кг/га д. р. Каб папярэдзіць развіццё хвароб, пасевы ячменю перад з'яўленнем флагавага ліста апрацоўвалі цілтам у дозе 0,5 кг/га прэпарата.

У задачу даследаванняў уваходзіла правядзенне ўлікаў, аналізаў і назіранняў (на двух несумежных паўторнасцях).

Аграфізічныя якасці глебы метадам насычэння ў патронах вызначалі перад перадпасяўной апрацоўкай, праз месяц пасля яе правядзення, перад уборкай ячменю ў слоі 0—10, 10—20 см; вільготнасць глебы — вагавым метадам у слоі 0—10, 10—20 см у дынаміцы (па фазах развіцця раслін); глыбістасць паверхні глебы — накладваннем палеткі пасля сяўбы ячменю (ДАСТ 2911-54), улічваліся глыбы памерам больш за 50 мм; засмечанасць пасеваў ячменю па відах пустазелля ўлічвалі на 25—30-ы дзень пасля правядзення хімічнай праполкі колькасна-вагавым метадам; гушчыню прадукцыйнага сцебластою ячменю вызначалі перад уборкай. Метэаралагічныя ўмовы за гады даследаванняў адрозніваліся значнай разнастайнасцю і нераўнамернасцю выпадання ападкаў за вегетацыйны перыяд ячменю. Яшчэ большая нераўнамернасць выпадання ападкаў адзначана па месяцах, у сувязі з чым гідратэрмічны каэфіцыент (ГТК) вар'іраваў у межах 1,24—3,40 пры сярэднім шматгадовым па норме 1,38—1,71.

Сума выпаўшых ападкаў за вегетацыю ячменю ў 1987 г. складала 355 мм, у 1988 г.— 310, у 1989 г.— 267 мм. Пры гэтым выпаданне іх у крытычныя перыяды развіцця раслін было вельмі нераўнамерным. Так, у 1989 г. ад пачатку ўсходаў не выпадала ападкаў дзве дэкады, а іх агульная сума за май складала толькі 17,6 мм супраць 51 мм па норме,

Таблiца 1. **Ураджайнасць зерня ячменю і гушчыня сцебластою ў залежнасці ад спосабаў асноўнай апрацоўкі цяжкасуглінкавай глебы**

Варыянт доследа	Ураджайнасць, ц/га				Гушчыня прадукцыйнага сцебластою, шт/м² (1987—1989 гг.)
	1987 г.	1988 г.	1989 г.	сярэдняя	
1. Чызеляванне 10 см + чызеляванне 10 см	61,8	48,2	45,6	51,9	558
2. Чызеляванне 10 см + чызеляванне 15 см	61,0	47,3	42,9	50,4	534
3. Чызеляванне 10 см + чызеляванне 20 см	59,7	47,8	44,2	50,6	564
4. Чызеляванне 15 см + чызеляванне 15 см	61,3	48,9	44,0	51,4	527
5. Чызеляванне 15 см + чызеляванне 20 см	60,1	50,6	43,1	51,3	552
6. Узворванне 20 см (кантроль)	64,1	47,4	43,9	51,8	554
7. Узворванне 15 см + чызеляванне 20 см	60,6	49,8	45,3	51,9	576
P, %	2,69	2,09	3,02		
$НІР_{095}$, ц/га	5,13	3,42	3,94		